УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
13 лютага 2020 г. № 51

# Аб устанаўленні юбілейнага медаля

У азнаменаванне 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў:

1. Устанавіць юбілейны медаль «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў».

2. Зацвердзіць Палажэнне аб юбілейным медалі «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў», яго апісанне і ўзор пасведчання да гэтага медаля (прыкладаюцца).

3. Фінансаванне расходаў на выраб юбілейных медалёў «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў» і пасведчанняў да іх ажыццявіць у межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на ўтрыманне Узброеных Сіл.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А.Лукашэнка**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
13.02.2020 № 51

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб юбілейным медалі «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў»**

1. Юбілейным медалём «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў» (далей – юбілейны медаль) узнагароджваюцца:

ветэраны Вялікай Айчыннай вайны;

былыя вязні фашысцкіх лагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны;

ваеннаслужачыя Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў Рэспублікі Беларусь, работнікі дзяржаўных органаў і іншыя асобы, якія ўнеслі значны ўклад у героіка-патрыятычнае выхаванне грамадзян Рэспублікі Беларусь, увекавечанне памяці загінуўшых, арганізацыю мерапрыемстваў, прысвечаных 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

2. Узнагароджанне юбілейным медалём ажыццяўляюць:

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

кіраўнікі дзяржаўных органаў у дачыненні да работнікаў гэтых органаў і іншых асоб, якія ўнеслі значны ўклад у героіка-патрыятычнае выхаванне грамадзян Рэспублікі Беларусь, увекавечанне памяці загінуўшых, арганізацыю мерапрыемстваў, прысвечаных 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне;

камандуючыя Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны, сіламі спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, войскамі аператыўных камандаванняў, начальнікі ваенных вучэбных устаноў у дачыненні да ваеннаслужачых Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў Рэспублікі Беларусь, якія ўнеслі значны ўклад у героіка-патрыятычнае выхаванне грамадзян Рэспублікі Беларусь, увекавечанне памяці загінуўшых, арганізацыю мерапрыемстваў, прысвечаных 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне;

ваенныя камісары ў дачыненні да ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых вязняў фашысцкіх лагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны, і іншых асоб, якія ўнеслі значны ўклад у героіка-патрыятычнае выхаванне грамадзян Рэспублікі Беларусь,

увекавечанне памяці загінуўшых, арганізацыю мерапрыемстваў, прысвечаных 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

3. Юбілейны медаль уручаюць:

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

кіраўнікі дзяржаўных органаў або па іх даручэнні іх намеснікі ці кіраўнікі іншых дзяржаўных арганізацый;

камандуючыя Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны, сіламі спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, войскамі аператыўных камандаванняў, начальнікі ваенных вучэбных устаноў;

камандзіры воінскіх часцей;

ваенныя камісары.

Аб уручэнні складаецца пратакол, які падпісваецца асобай, што ўручыла юбілейны медаль. Пратакол захоўваецца па месцы ўручэння юбілейнага медаля.

4. Асобам, якія ўзнагароджаны юбілейным медалём, выдаецца пасведчанне ўстаноўленага ўзору.

5. Юбілейны медаль носіцца на левым баку грудзей форменнага або цывільнага адзення і пры наяўнасці іншых медалёў размяшчаецца пасля юбілейнага медаля «75 год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

6. Паўторнае ўзнагароджанне юбілейным медалём не ажыццяўляецца. Дублікаты юбілейнага медаля і пасведчання да яго ўзамен згубленых не выдаюцца. Пры страце юбілейнага медаля дазваляецца нашэнне планкі ўстаноўленага ўзору.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
13.02.2020 № 51

**АПІСАННЕ**
**юбілейнага медаля «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў»**

1. Юбілейны медаль «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў» (далей – юбілейны медаль) вырабляецца з латуні і мае форму круга з борцікам дыяметрам 32 мм.

2. На вонкавым баку юбілейнага медаля размешчана кампазіцыя: воін-пераможца з разгорнутым сцягам, партызан з аўтаматам ва ўзнятай руцэ і жанчына з букетам кветак. Зверху кампазіцыі: па баках – выява салюту, у цэнтры – лічбы «1945–2020».

3. На адваротным баку юбілейнага медаля ў цэнтры размешчаны надпіс «75 ГОД ПЕРАМОГІ Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ 1941–1945» у сем радкоў. У ніжняй частцы адваротнага боку – лаўрова-дубовы вянок, які абвіты стужкай па тры разы з кожнага боку.

4. Усе элементы юбілейнага медаля рэльефныя.

5. Юбілейны медаль пры дапамозе вушка і кольца злучаецца з пяцівугольнай калодкай, абцягнутай шаўковай муаравай стужкай шырынёй 24 мм з элементамі расфарбоўкі стужак калодак медалёў «За адвагу» і «Партизану Отечественной войны» I ступені. Стужка калодкі юбілейнага медаля блакітнага колеру, краі якой абведзены падоўжнай палоскай сіняга колеру шырынёй 2 мм. Пасярэдзіне стужкі размешчана падоўжная палоска светла-зялёнага колеру шырынёй 12 мм, па цэнтры якой – падоўжная палоска чырвонага колеру шырынёй 2 мм.

На адваротным баку калодкі знаходзіцца шпілька для мацавання юбілейнага медаля да адзення.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
13.02.2020 № 51

**УЗОР**
**пасведчання да юбілейнага медаля «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў»**


РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ

ПАСВЕДЧАННЕ

ДА ЮБІЛЕЙНАГА МЕДАЛЯ

"75 ГОД ПЕРАМОГІ Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ 1941 – 1945 ГАДОЎ“

ПАСВЕДЧАННЕ

……………………………………………

……………………………………………

……………………………………………

узнагароджаны(а)
юбілейным медалём

"75 ГОД ПЕРАМОГІ Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ 1941 – 1945 ГАДОЎ“

"……“ ……………………… 20 г.

……………………………………………
(пасада і подпіс асобы, якая
……………………………………………
уручыла юбілейны медаль)

М.П.